ролетары усіх краёў злучайцеся!

Чырвоная Зьмена

№ 15 (983) | СУБОТА, 18-га студзеня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Зьлёту „ЛК“ Фрунзэўскага раёну

У дзень зьлёту «Лёгкім Кавалерыстам» Фрунзэўскага раёну—шчырае прывітаньне.

На вас партыяй і рабочай клясай ускладаюцца пачэсныя і адказьнейшыя абавязкі. Вы павінны зьяўляцца ўдарным атрадам. ударнай групай, сумесна з камсамольскімі масамі і пад кіраўніцтвам партыі змагацца на перадавых пазыцыях клясавых боек за ажыцьцяўленьне яе генэральнай лініі, за шпаркі тэмп соцыялістычнага будаўніцтва.

Ваш зьлёт павінен паслужыць яшчэ большаму ўзмацненьню клясавай дбайнасьці, яшчэ большаму паляпшэньню і паглыбленьню вашай работы на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“.

Вынікі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б

З дакладу тав. ГЕЯ на менскім партактыве)*

...ясавыя зрухі і барацьба ...генэральную лінію партыі

Таварышы, наша партыя пра...ла пасьпяхова і пераможна зма...ньне з трацкіцска-зіноўеўскай опо...цыяй, якая прадстаўляла опар...ністычны ўхіл у радох нашай ...ртыі пад прыкрыцьцём „левых“ ...аз.

На вашай памяці прайшла гэта ...рацьба з так званым „левым“ ...лам, па сутнасьці справы з ...артунізмам, які прыкрываўся, ...ак, „левымі“ фразамі, які віна...ціў нашу партыю ў тэрмідары...стве, у забыцьці клясавай палі...кі, у здачы клясавых позыцый ...г. д., і г. д.

...Ня так даўно мы былі сьведкамі ...ўнага развалу троцкісцкай опо...цыі.

Пасьля пастановы зьезду пар...і, які прызнаў трацкісцкія по...яды нясумяшчальнымі з прыбы...ньнем у партыі, нам прышлося ...ранесьці агонь направа і ў апош...я два гады галоўнай небясьпекай ...ла правая адкрыта опартуністыч...я небясьпека; галоўная барацьба ...шай партыі ішла па гэтай лініі.

Тав. Молатаў на апошнім пле...ме ЦК партыі так характарызуе ...тнасьць разыходзін з правымі: ...арашце, у аснове спрэчак ля...ыць розная ацэнка клясавых сіл, ...зныя адносіны да клясавай ба...цьбы, рознае разуменьне кляса...х задач“. Барацьба з групай ...кава, Бухарына і Томскага ішла, ...кім чынам, па ўсіх пытаньнях ...нэральнай лініі.

Зараз мы перажываем пэрыяд, ка...і правы ўхіл прымушаны да ...ступленьня. Адступаючы, ён ро...ць гэта ня шчыра, ня сумленна, ...проста, стараючыся змазаць ...зталосьсі і прадставіць справу ...к, што быццам-бы правыя супя...чылі толькі супроць надзвычай...ых мер, а з генэральнай лініяй ...ртыі былі згодны.

Досыць перабраць асноўныя пы...ньні нашых разыходзін з правы..., хаця-б толькі ў галіне нашай ...лянскай палітыкі, каб убачыць, ...то гэтыя залвы прадстаўляюць з ...бе вяшчырую, двуліцую спробу ...дняй лічбай прадставіць справу ...лепшым выглядзе чым яна аб...ала. Сапраўды-ж правыя за...ст палітыкі наступленьня на ка...талістычныя элемэнты вёскі і го...ду прапаноўвалі палітыку адступ...ньня. Правыя выступаюць з асаб...вай палітычнай пляцформай.

Асноўныя масы сялянства пад ...раўніцтвам рабочых ідуць зараз ...колектывы, ствараючы прадпа...ылкі д я далейшага пабудаваньня ...цыялізму на вёсцы і для выкар...ўваньня караньняў капіталізму, ...ючы гэтым самым лепшы адказ ...характар нашых узаемаадносін ...сялянствам. Іменна посьпехі на...ай палітыкі, посьпехі соцыялістыч...ага будаўніцтва і вялізарныя кля...вых зрухі на вёсцы тлумачаць ...ой факт, што правыя прымушаны ...а адступленьня. І якраз тая ака...ічнасьць, што мы толькі што мелі ...оўную капітуляцыю трацкістых, ...то мы перажываем зараз паласу ...дступленьня правых ухілістых,—...эта акалічнасьць можа стварыць у партыі небясьпеку дэмабілізацыйных настрояў. Можа стварыць уражаньне, што н м можна адпачыць і не займацца пытаньнямі барацьбы з ухіламі. Гэта было-б няправільнай пастаноўкай пытаньня.

Задача партыйнай організацыі заключаецца і надалей у тым, каб вытлумачваць усю памылковасьць поглядаў права-опартуністычнага ўхілу—гэтай галоўной небясьпекі на даным этапе—і, не абмяжоўваючыся аднэй растлумачальнай работай, няўхільна ўзмацняць барацьбу з ідэолёгіяй і практыкай правага опортунізму. Мы маем рад скрыўленьняў партыйнай лініі ў розных галінах савецкай, коопэрацыйнай, гаспадарчай і партыйнай работы.

Без самакрытыкі, бяз шырокага ўдзелу ўсёй партыйнай і беспартыйнай масы ў праверцы, у выпраўленьні падахопаў нашай штодзённай работы, мы гэтых скажэньняў ня выявім і ня выправім. Там, дзе мы маем адзнакі заціску самакрытыкі, там мы павінны з усёй рашучасьцю навальіцца на тых, хто перашкаджае ўдзелу шырокіх мас рабочых і асноўных мас сялянства ў справе выпраўленьня памылак у нашай рабоце.

Правая небясьпека паранейшаму застаецца галоўнай, асноўнай небясьпекай. Але трэба сказаць некалькі слоў аб магчымасьці на даным этапе і некаторых „левых“ загібаў: „Калі наша партыя змагаецца супроць „левага“ фразэрства, да асноўнага ядра партыі далучаецца няўхільна частка правых элементаў. Калі партыя пераносіць асноўны агонь супроць правых, разам з асноўным ядром партыі ідуць і тыя, хто, імкнучыся да перамогі над правымі, разьлічвае не на тое, каб абараніць ідэю моцнага саюзу рабочае клясы з серадняком і падвесьці пад гэты саюз новую вытворчую базу (колгасы), а на тое, каб адыйсьці ад ідэі моцнага саюзу з серадняком, праз організацыю саюзу бедняты“ (Сталін).

Правая небясьпека паранейшаму застаецца асноўнай небясьпекай і змагацца з ёю трэба і растлумачэньнем, і праверкай практычнай работы ўсіх організацый і ўстаноў. Побач з гэтым партыі трэба быць гатовай даць адпор і «левым» загібам, там, дзе яны ўзьнікаюць.

Посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі партыі. Гэтыя посьпехі заключаюцца перш за ўсё у бурным росьце нашай прамысловасьці.

Гэты рост прамысловасьці абумовіў у асноўным і той вялізарны зрух у пытаньнях колектывізацыі, які мы зараз перажываем.

Пытаньні колектывізацыі і задачы веснавой пасяўной кампаніі

Не выпадкова таму пленум ЦК КП(б)Б, які скончыўся гэтымі днямі, паставіў першым і асноўным пытаньнем свайго парадку дня пытаньне аб колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Па Беларусі паводле даных, якія адносяцца да другой паловы сьнежня, мы мелі звыш 21 проц. усёй сельска-гаспадарчай плошчы пад колгасамі.

У канцы 1928 году ў Беларусі лічылася пад колгасамі 94000 гэкт. да канца-ж 1929 году мы мелі ўжо 1498000 гэкт. Гэта вялізарнейшы зрух.

Працэс колектывізацыі, яго бурны рост і імклівыя тэмпы паказваюць, што шляхі будаўніцтва соцыялізму прайшлі зусім ня там, дзе іх бачылі правыя ўхілістыя. Папершае, рост колектывізацыі дазволіў партыі зараз паставіць задачу, якая зьяўляецца асноўнай палітычнай задачай партыі на бліжэйшы адрэзак часу, —**задачу ліквідацыі кулацтва, як клясы**. На працягу раду год ад VIII зьезду партыі з 1919 году мы праводзілі палітыку абмежаваньня эксплёататарскіх імкненьняў кулацтва. Зараз мы маем выстарчальную базу і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы для таго, каб паставіць перад сабой задачу **ліквідацыі кулацтва, як клясы.**

Кулацтва зьяўляецца буйнейшым атрадам буржуазіі ў нашай краіне. **Мы павінны ліквідаваць кулацтва, як клясу.**

Рост колектывізацыі паказвае нам шляхі пабудаваньня соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Стварэньне колгасаў адкрывае нам новыя магчымасьці кіраваць сельскай гаспадаркай, накіроўваць яе разьвіцьцё ў пажаданы для нас бок, увесьці новыя мэтады апрацоўкі зямлі, новыя машыны, павышаць прадукцыйнасьць працы ў сельскай гаспадарцы і ўводзіць тыя ці іншыя культуры.

Нарэшце, разьвіцьцё колектыўнага руху дазваляе нам паскорыць тэмп разьвіцьця ўсёй нашай соцыялістычнай гаспадаркі.

Наш апошні пленум ЦК КП(б)Б шчыльна заняўся пытаньнем колектывізацыі.

Пленум устанавіў заданьне: **ня меньш 35 проц.** яравога кліну апрацаваць і засеяць колектыўнымі гаспадаркамі ў бліжэйшую вясну. Гэта ставіць перад намі надзвычайна сур'ёзную задачу ў галіне праводзеньня веснавой сяўбы. **Увосень 1930 году мы разьлічваем мець па Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы палову ўсёй пасеўнай плошчы занятай пад колгасамі.** Пленум пастанавіў, што колектывізацыя ўсіх беднацка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак павінна быць закончана ў межах нашай рэспублікі да канца 1931 году, г. зн. на працягу двух год.

Пленум падкрэсьліў тую думку, якая каранілася і ў апошняй пастанове ЦК УсеКП(б) аб тым, што партыя павінна самым рашучым чынам увікнуць памылак у бок затрыманьня разьвіцьця калгасаў. Затрыманьне разьвіцьця колектыўных гаспадарак было-б найвялікшай памылкай.

Пленум асабліва спыняўся на пытаньнях клясавай барацьбы ў вёсцы, у сувязі з разьвіцьцём колектывізацыі. Ясна, што кулак дарам сваіх позыцый ня здасьць, ліквідаваць кулацтва, як клясу, можна **толькі ў самай жорсткай** і часамі ў крывавай барацьбе з кулацтвам.

Бухарын прадстаўляў сабе справу так, што ў нас ня можа быць вострай клясавай барацьбы. Раз, моў мы рушымся да соцыялізму, соцыялістычны сэктар павялічваецца і ўзрастае, адціскае капіталістычны сэктар на больш слабыя позыцыі, —гэты аслаблены капіталістычны сэктар ня здолее аказваць нам упартага супраціўленьня.

У сапраўднасьці, аднак, адбываецца ня так.

У апошнія месяцы, напрыклад, наглядаецца рост кулацкага тэрору ў межах Беларусі, абвастрэньне клясавай барацьбы.

Пленум пацьвердзіў раней прынятую пастанову аб тым, каб кулака ў колгасы ня пускаць. Яго трэба вывесьці на сьвежую ваду там, дзе ён пасьпеў у колгасы пралезьці. Трэба гнаць кулакоў з колгасаў там, дзе яны ўжо пралезьлі. Пленум зьвярнуў увагу ў сваіх пастановах на пытаньні пастаноўкі работы з беднатой. Групы бедняты ў вёсках і сёлах павінны зьявіцца нашай апорай у справе правядзеньня колектывізацыі.

Пленум прыняў пастанову, якая прадугледжвае стварэньне груп бедняты ў колектыўных гаспадарках, асабліва ў колгасах прасьцейшага тыпу, бо ў колектывах захоўваюцца яшчэ асобныя моманты клясавай барацьбы. У асобе груп бедняты мы будзем мець апору для таго, каб захаваць гэтыя колгасы ад развалу.

Такім чынам, пытаньне аб кулаку, пытаньне аб далейшым бязьлітасным наступленьні на кулака было адным з асноўных на пленуме ЦК.

Гэтае пытаньне ставілася часамі і ў некалькі прымітыўнай форме: куды дзяваць кулака, калі мы ствараем колгас?

Ясна адно, таварышы, ствараючы колектыўныя гаспадаркі, мы ня можам пакінуць кулака, каб яго зямля пераплёталася з зямлёй колгасу, ня можам дапусьціць, каб кулак праводзіў у колгасах сваю шкодную, падрыўную работу. Пры земляўпарадкаваньні колгасаў нам абавязкова трэба выдзеліць для колектыўных гаспадарак суцэльныя масывы зямлі, неразьбітыя, не перарэзаныя палямі і землямі кулакоў, якіх мы ў колгасы ня пусьцім.

Толькі ў выніку няўхільнага і выразнага праводзеньня генэральнай лініі нашай партыі мы здолелі паставіць перад сабой задачу ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Серадняк свой выбар зрабіў і пашоў за пролетарыятам па шляху колектывізацыі. Усё гэта адбываецца ў абставінах яшчэ большага абвастрэньня клясавай барацьбы на вёсцы. Зусім відавочна, што серадняк толькі тады перастане хістацца, калі адна з кляс—сельская буржуазія—кулацтва—будзе ліквідавана і калі пад кіраўнічым уплывам пролетарыяту на базе індустрыялізацыі с.-г. соцыяльная прырода серадняка будзе перароблена. І таму ліквідацыя матар'яльнай асновы кулацтва зьяўляецца нашай асноўнай задачай, якая пастаўлена перад намі цяперашнім этапам будаўніцтва соцыялізму.

Кулацкія сродкі вытворчасьці павінны організавана пераходзіць у грамадзкую ўласнасьць колгасаў. Гэтым самым ліквідуецца экапамічная і вытворчая база кулацтва як клясы. Зусім зразумела, што раскулачваньне патрабуе вялізарнейшай організацыі беднацка - серадняцкіх мас, патрабуе вялізарнейшай мобілізацыі ўсіх партыйных організацый.

Разгорнутым фронтам партыя павяла яшчэ больш бязьлітаснае наступленьне на кулака. І ніякіх хістаньняў партыя ў барацьбе за ліквідацыю кулака, як клясы, не дапусьціць. Беднацка-серадняцкія масы вёскі пры кіраўнічай дапамозе рабочае клясы і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі ліквідуюць кулацтва, як клясу.

Савецкія гаспадаркі павінны зьяўляцца кіраўнічым фактарам у вёсцы

У пытаньнях колектывізацыі вялізарнейшую ролю павінны адыграць нашы савгасы. На пленуме адзначаліся імкненьні да ліквідацыі савгасаў, шляхам зьліцьця іх з колгасамі. Гэта ў корані няверна. Савецкія гаспадаркі павінны зьяўляцца кіраўнічым фактарам у вёсцы: савецкія гаспадаркі будуць зьяўляцца кіраўнічым фактарам у справе машынізацыі вёскі, організацыі трактарных калён, організацыі конна-трактарных баз і г. д.

Таму ня толькі недапушчальны якія-небудзь хістаньні ў бок ліквідатарскіх настрояў у адносінах да савецкіх гаспадарак, але наадварот —з усёй рашучасьцю, выразнасьцю і яснасьцю павінна быць падкрэслена новая, больш адказная і больш высокая роля, якая выпадае на савецкія гаспадаркі ў сувязі з калектывізацыяй.

Рабочая кляса ў цэлым і наша партыя ў першую чаргу, як авангард рабочае клясы, павінна даць організатараў для вёскі. Гэту організуючую ролю мы выконваем, накіроўваючы зараз у вёску тысячы лепшых рабочых і лепшых камуністых з гораду. Машыназабесьпячэньне вёскі павялічваецца з году ў год. Мы і ў гэтым годзе атрымаем большую колькасьць трактараў, чым у мінулым годзе. Відавочна, што ў бліжэйшыя год-два-тры выкарыстаньне пераваг колгасаў можа быць дасягнута толькі шляхам найлепшай організацыі працы ў колгасах, шляхам строгай экономіі сіл і сродкаў і дакладнай організацыі і разьмеркаваньня працы ўнутры саміх колектыўных гаспадарак. Асаблівае значэньне набывае коннацягавая сіла, якая павінна быць у максымальнай ступені выкарыстана. Гэтыя вялізарныя задачы падаюць на плечы нашай партыі таму, што роля організатараў належыць іменна нам.

Да надыходзячай веснавой сяўбы мы павінны рыхтавацца ўсімі сіламі. Пленум аднёсься да задачы падрыхтоўкі. веснавой пасеўнай кампаніі як да сур'ёзьнейшага экзамена на шляху соцыялістычнага перабудаваньня сельскай гаспадаркі.

*) Даклад тав. Гея друкуецца у скарочаным відзе. Працяг у заўтрашнім нумары.

Зьлёт „Л. К.“
ФРУНЗАУСКАГА РАЕНУ

Сёньня 18 студзеня ў клюбе Карла Маркса а 6-й гадзіне ўвечары адчыняецца 1-шы раённы зьлёт „Лёгкай Кавалерыі“ Фрунзаўскага раёну.

Парадак дню:

1. Даклад АКК РСІ (т. Дамброўскі).
2. Чарговыя задачы Фрунзаўскай організацыі ЛКСМБ—зьмест і формы работы „Л. К.“ (т. Харкоў).
3. Гутарка дэлегатаў зьлёту з наркаматамі.
4. Выбары раённага штабу „Л. К.“.
5. Выбары дэлетаў на ўсебеларускі зьлёт.

Мандаты у Р. К.

Агляд газэты „Камунар Магілеўшчыны“
Даклад камісіі сэктару друку ЦК КП(б)Б на Бюро Акругкому
Узбуджаецца хадайніцтва аб пераводзе газэты на штодзеннае выданьне

На спэцыяльным паседжаньні Бюро Магілеўскага Акругкому КП(б)Б заслухан даклад камісіі сэктару друку АПАД ЦК КП(б)Б па правядзеньню агляду-абсьледваньня газэты „Камунар Магілеўшчыны“.

Бюро Акругкому КП(б)Б ухваліла поўнасьцю згадзіцца з матар'яламі, вынікамі і прапановамі камісіі, якія будуць прадстаўлены на разгляд Агітпропу і Сакратарыяту ЦК КП(б)Б.

У пастанове Бюро Акругкому адзначаецца, што „... ОРГАНІЗАЦЫЯ АГАЯДУ—АБСЬЛЕДВАНЬНЯ ПОЎНАСЬЦЮ СЯБЕ ЗАПРАЎДАЛА І БЫЛА ЗЛУЧАНА. ЯК З АКАЗАНЬНЕМ НЕПАСРЭДНАЙ ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ І ІНСТРУКТАВАНЬНЯ АПАРАТУ РЭДАКЦЫІ, ГЭТАК З ЗНАЧНЫМ ЗАВАСТРЭНЬНЕМ УВАГІ ДА АКРУГОВАЙ ГАЗЭТЫ З БОКУ ПРАЦОЎНЫХ ГОРАДУ І ВЁСКІ. У ПРЫВАТНАСЬЦІ МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ, ШТО, РАЗАМ УЗЯТАЕ, СПРЫЯЕ ЗАМАЦАВАНЬНЮ АЎТАРЫТЭТУ ГАЗЭТЫ, ПАЛЕПШАНЬНЮ ЯКАСЬЦІ І ПАВЯЛІЧЭНЬНЮ РАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ“.

Побач з гэтым Бюро Магілеўскага Акругкому КП(б)Б лічыць, што „вычэрпнае выкананьне надзвычайна алказных задач, якія паўстаюць перад газэтай, у зьвязку з суцэльнай колектывізацыяй акругі, магчыма пры ўмове тэрміновага павялічэньня фармату газэты і пераводу яе на штодзённае выданьне, улічваючы значна ўзросшыя тэмпы работы ў вёсцы, тэмпы колгаснага будаўніцтва і абвострануюю клясавую барацьбу, што, разам узятае, патрабуе забясьпечыць з боку кіруючых партыйных органаў яшчэ большае ўзмацненьне кіраўніцтва, адной з лепшых форм якога—зьявіцца стварэньне штодзённай газэты“.

Незалежна ад вырашэньня пытаньня аб стварэньні штодзённай газэты, БЮРО АКРУГКОМУ ЎЖО ЗАРАЗ ПРЫНЯЛО ШЭРАГ ЭНЭРГІЧНЫХ І КАНКРЭТНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ПАЛЕПШАНЬНЮ УМОЎ РАБОТЫ РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ „КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ“.

У прыватнасьці Бюро Акругкому ўхваліла, значна павялічыць штат рэдакцыі. Акрза вылучае агранома-комуністага для сталай работы ў газэце, рэдакцыі прадстаўляецца новае памяшканьне і г. д.

У зьвязку з тым, што ў шэрагу колгасаў яшчэ ня скончана абгаварэньне дакладаў рэдакцыі—мяркуецца „закочны мітынг чытачоў“ скончыць не раней, як праз два тыдні.

Конфіскаваць усе сродкі вытворчасьці кулако[...]
ЯКІЯ ЗЛОСНА ЗЬНІШЧАЮЦЬ ЖЫВЁЛУ, АЛЬБО АГІТУЮЦЬ ЗА ГЭТ[...]
Пастанова Савету Народных Камісараў БССР пра мерапр[ы]емствы для спыненьня масавага забою, распродажу жывёл[...]

Для спыненьня масавага забою і распродажу буйнае рагатае жывёлы і коняй, што перашкаджае пасьпяховаму выкананьню задач колектывізацыі і ўздыму вытворчасьці сельскай гаспадаркі і забясьпечаньню хутка растучых патрэб соцыялістычнай прамысловасьці ў сырцы, а таксама забясьпечаньню прадуктамі харчаваньня рабочага спажыўца, Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Даручыць акруговым выканаўчым комітэтам, Народнаму Комісарыяту Зямляробства, Белколгасцэнтру і Белмалжывёлсаюзу правесьці спэцыяльную шырокую кампанію па растлумачэньні бядняцка-серадняцкім масам сялянства пра вялізарную шкоду, якую яны наносяць колгаснаму будаўніцтву, уздыму ўраджайнасьці і вытворчасьці сельскай гаспадаркі масавым продажам продукцыйнае жывёлы і коняй.

2. Для максымальнай мобілізацыі ўвагі ўсяе савецкае грамадзкасьці, рабочае клясы, колгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства па пытаньню далейшага разьвіцьця жывёлагадоўлі, лічыць неабходным правесьці ў БССР з 20 студзеня па 20 лютага 1930 г. месячнік жывёлагадоўлі, асноўнымі задачамі якога паставіць:

а) шырокую растлумачальную працу сярод колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства пра шкоду масавага зьнішчэньня прадукцыйнай малочнай жывёлы і коняй;

б) правядзеньне сапраўдных мерапрыемстваў, забясьпечваючых аграмаджаньне продукцыйнае жывёлы і коняй бядняцка-серадняцкага сялянства, якія ўваходзяць у колектыўныя гаспадаркі, а таксама шляхам організацыі буйных спэцыяльных жывёлагадоўчых гаспадарак;

в) узмацненьне з боку зямельных органаў малочна-жывёлагадоўчай кооперацыі па выкананьню агромінімуму, кантрактацыі маладняка, буйнае рагатае жывёлы і малочных продуктаў;

г) узмацненьне сіл і сродкаў калгасаў і бядняцка-серадняцкага сялянства на мерапрыемствы па рэконструкцыі жывёлагадоўлі, палепшаньні кармавое базы шляхам павярхоўвага палепшаньня сенажацяй і пашырэньня засеву плошчаў пад травамі і карняплодамі.

3. Даручыць Народнаму Комісарыяту Зямляробства разам з Белколгасцэнтрам і Белмалжывёлсаюзам тэрмінова ўстанавіць мінімум аграмаджаньня сродкаў вытворчасьці, у тым ліку і жывёлы, для розных ступеняў колгасаў. Разам з гэтым ужыць захады да забясьпечаньня аграмаджаньня усяе продукцыйнае жывёлы, як у організаваных, гэтак і ў тых колгасах, што организоўваюцца.

4. Дазволіць раённым выканаўчым комітэтам конфіскаваць усю жывёлу, сельска-гаспарчы інвэнтар і пазбаўляць права карыстацца зямлёй усіх кулакоў, якія злосна зьнішчаюць жывёлу, альбо падбухторваюць беднякоў і серадняков да зьнішчэньня жывёлы. Адначасова даручыць Наркомюсту пасіліць судовыя пакараньні кулакоў за вышэйпаказаныя злачынствы.

Даручыць Белколгасцэнтру распрацаваць і ажыцьцявіць неабходныя мерапрыемствы забароны прыёму ў калгасы і ачысткі з калгасаў гаспадарак, якія паддаліся злоснай агітацыі кулацтва і зьнішчылі жывёлу, альбо іншы інвэнтар перад уваходам у колгас.

5. Забараніць гаспадаркам, як аграмаджанага сэктару, так і індывідуальным гаспадаркам, забой маладняка, асабліва цялят і сьвіньняў. Народнаму Камісарыяту Зямляробства устанавіць узрост асобных катэгорый маладняка, забой якога забараняецца.

6. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю і акруговым выканаўчым комітэтам устанавіць сталыя пляцы куплі і продажу продукцыйнае жывёлы і коняй, забараніўшы продаж і куплю жывёлы па-за межамі гэтых пляцоў. Разам з гэтым забараніць забой рагатае жывёлы і асабліва коняй без папярэдняга вэтэрынарна-санітарнага агляду.

Загатоўкі малочнай жывёлы ўскласьці выключна на Беларускі Малочна-жывёлагадоўчы саюз.

7. Адзначаючы выпадкі няпрыёму паасобнымі колгасамі продукцыйнай малочнай жывёлы, запрапанаваць Белколгасцэнтру зьнішчыць гэтыя зьявішчы, прыц[...] ючы ў асобных выпадках ві[...] тых асоб да крымінальнай ад[...] насьці.

8. Даручыць Народнаму Ка[...] рыяту Земляробства, Белкол[...] цэнтру, Белмалжывёлсаюзу і [...] сельтрэсту ўзмацніць загат[...] коняй для забясьпечаньня цяг[...] сілаю конна-машынных станц[...] колгасаў, зрабіць загатоўку р[...] чае жывёлы для замены імі ва[...] як цягавае сілы, зьвязацца з с[...] нымі загатоўчымі організац[...] для закупкі і вывазу лепшых [...] няй.

9. Для пашырэньня загат[...] малочнае жывёлы, для забяс[...] чаньня ёю савгаса і калгасаў, прапанаваць Беларускай Кант[...] Дзяржаўнага Банку забясьпеч[...] выкананьне пастановы Савету [...] цы і Абароны за 16-XII—29 г., [...] ўстаноўлены парадак канчатко[...] разьлікаў па фінансаваньню г[...] апэрацый.

10. Даручыць Эканамічнай Н[...] дзе вырашыць на працягу ты[...] ўсе пытаньні, зьвязаныя з фі[...] саваньнем мерапрыемстваў па [...] вёлагадоўлі.

11. Даручыць Народнаму Ка[...] рыяту Земляробства, Белко[...] цэнтру і Белсельтрэсту распр[...] ваць на працягу месяца мера[...] емствы на ўтрыманьню і ха[...] ваньню жывёлы у летні пэры[...] тых гаспадарках, у якіх к[...] касьць жывёлы, у выніку м[...] прыемстваў па павялічэньню [...] да, будзе значна перавышаць [...] мельныя ўжыткі.

12. Дазволіць акруговым в[...] наўчым комітэтам, па даных р[...] ных выканаўчых камітэтаў, на[...] даць адміністрацыйныя спагна[...] на асоб, за парушэньне арт. 5 [...] гэтае пастановы, штраф у раз[...] ры да 100 руб.

13. Даручыць Народнаму К[...] сарыяту Гандлю разам з Народ[...] Комісарыятам Земляробства [...] працаваць інструкцыю для аж[...] цыяўленьня гэтае пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕ[...]
Кіраўнік Спраў Савету Народ[...] ных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. КАЛЕВ[...]

12 студзеня 1930 г.
г. Менск.

Ліст з шклоускага процэсу

(Ад нашага спэц. корэспондэнта)

І. Сьмерць Антона Багайскага

23-га лістапада 1929 году „Чырвоная Зьмена“ на сваіх старонках, па корэспондэнцыі т. Галодкі, узьняла пытаньне аб самагубстве рэдактара насьценнай газэты ф-кі „Спартак“—А. Багайскага.

Цяпер гэта справа разглядаецца Выязной Сэсіяй Вярхоўнага суду Рэспублікі ў гор. Шклове.

Ніжэй мы друкуем першы нарыс нашага спэцыяльнага корэспондэнта, які выехаў на шклоўскі процэс.

10-га лістапада, а 7-й гадзіне і 13 хвілін увечары, гулкая і сьветлая цішыня дызэльнай залі на адну сэкунду ўвабрала ў сябе тупы і цяжкі трэск ламаемых са страшнай сілай чалавечых касьцей. Гэта ўсё адбылося з такою непараўнальнай хуткасьцю, што нават ніхто з тых, хто знаходзіўся блізка, не пачуў апошняга роспачнага крыку чалавека, якога рвала і крышыла 9 таўшчэзных раменных пасаў.

... Антон Багайскі—ня сьмела ўвайшоў у гэтую залю, кінуўшы на парозе кароткі піджак.

Патрымаўшыся хвіліну за халодныя ручкі жалезнай агарожы, з гэтага самага месца, дзе цяпер я стаю з яго старым і зьнядужаным горам бацькам,—кінуўся ўніз у чорны і страшны прахон, дзе 9 таўшчэзных раменных пасаў прабягаюць вакол чыгуннага паўтарасажнёвага махавіка.

Там унізе, на паваленых дошках і знайшлі сьцякаючае крывёю мёртвае, непазнаванае цела Антона Багайскага,—рэдактара „Спартакаўца“, скончыўшага жыцьцё сваё ганебным і недастойным комуністага ўчынкам.

15-гадовым хлапчуком прышоў Антон на фабрыку, стаўшы падручным на электростанцыі.

У 1922 годзе—ён ужо рабфакавец; у 1926 годзе ён ізноў пасьля сканчэньня рабфаку на сваёй фабрыцы,—электраманцёр.

З гэтага часу ён становіцца актыўным рабкорам, а праз год і старшынёю рэдколегіі фабрычнай газэты.

З групай актыўных рабкораў ён пачынае бічаваць заводзкія недахопы.

На электростанцыі—безгаспадарнасьць, безалабернасьць, захованае і яўнае шкодніцтва, абсталяваньне знаходзіцца ў хаотычным парадку. Кожную хвіліну магло здарыцца, што фабрыка загарэлася-б як сьвечка,—фабрыка магла ўзарвацца. „Шкуравы“ чакалі добрага моманту.

Паплаўскі, Шкураў і Моцны—трымалі гэты небясьпечны вузел у сваіх руках. Яны ўладалі жыцьцём фабрыкі,—становішчам 700 чалавек рабочых.

Антон Багайскі пачынае пісаць аб гэтым у насьценгазэту і незадаволіўшыся тым, што завадзкая адміністрацыя глуха маўчала на сыгналы рабкораў,—Багайскі піша ў цэнтральныя газэты, завода-кіраўніцтву і органам ДПУ.

Конвэрты Багайскага ўскрываюцца Шкуравым-тагачасным загадчыкам электростанцыі. Паплаўскі і Моцны, электроманцёры станцыі, пачынаюць цкаваць Антона. Раздаюцца іх галасы:

— Хуліган!

— Падлец!

— „Ну, видно допишется до конца, мы выявим эту личность и знаем что с ним делать“...

Рабкоры фабрыкі, даведзеныя такім парадкам да роспачы, пішуць тады ў „Зьвязду“—аб усіх гэтых фактах і надпісваюцца на лісьце паперы, на выпадак ускрыцьця конвэрта, у выглядзе кола, так, каб нельга было даведацца, хто падпісаўся першым. Гэта была арыгінальная, але несумяшчальная і сумная ў нашых савецкіх умовах —выдумка...

Шкураў ня сьпіць. Разумны вораг робіць усё, што ў яго сілах, каб зжыць са сьвету Багайскага. Цёмныя сілы акутваюць рэдактара газэты, якая першая моцна і сьмела заявіла аб балючых баках фабрычнага жыцьця. Але ў гэты самы час у генэратар № 1, моцнасьцю ў 150 кілёват, падкідваюць болцік...

Пуск машыны з падкінутай нязначнай жалезнай рэччу пагражаў узрывам. Шкураў заяўляе, што гэта зрабіла вопытная рука і абвінавачваньне накіроўваецца супроць Багайскага.

Кола цкаваньня, якое пачынала пераходзіць ужо усякія меры, сьціскалася болей і болей.

8-га сьнежня, у той самы дзень, калі вылучаная камісія пачала расьсьледваньне ненармальных узаемаадносін паміж Багайскім і групай Шкурава,—Шкураў сам, без дапамогі электра-манцёраў, пачынае чысьціць матор цэнтрабежнага насосу вадакачкі, які забясьпечвае вадою ўсю фабрыку.

Астаноўка матора, — астаноўка насоса, і астаноўка ўсяе фабрыкі. І ў сфэры пятушкоў якара, загадчык, падышоўшы к сілавым устаноўкам, знаходзіць зноў нязначны і маленькі болцік, які пагражае страшэнным выбухам.

Усё гэта прыпісваецца, ВОПЫТНАЙ РУКОЙ ШКУРАВА—рэдактару насьценгазэты, таму самаму, які піша аб Шкураве—Антону Багайскаму.

Так выжывалі чалавека, так марудна і ціха, няпрыкметна і бясшумна штурхалі яго к сьмяротнаму дызэлю.

На гэты раз Вярхоўны Суд Рэспублікі засядае на сцэне клюбу ф-кі „Спартак“.

У перапоўненай залі сабралася свая, цесна спаяная рабочая сям'я.

Яна ўважліва сочыць за паказаньнямі трох абвінавачаных па справе Багайскага—Шкурава, Паплаўскага і Моцкага.

Шкураў — галоўны абвінавачваемы.

Ён тонкі і хітры вораг. Суд з напружанасьцю распутвае сеці, сцэпленыя гэтым разумным ворагам. Рабочая маса сустракае ўхмылкамі і сьмехам правал тэй рызыкоўнай гульні, якую пачаў Шкураў.

Паплаускі—сын акцызнага чыноўніка,—маўчыць.

Моцны—маленькі, жалкі чалавечак; нізкі, прыплюснуты лоб. Бегаючыя вочкі, пабітая, нахабная ухмылка. Ён царапаецца за нешта і просіць усё, каб як найболей выклікаць сьведак.

Шкураў вядзе галоўную скрыпку ў гэтым трагічным концэрце.

Ён не прызнае сябе ні ў якой меры вінаватым, за ім паўтараюць гэта як па заучанаму і двое іншых падсудных.

Шкураў быў у партыі. Да партыі ён пабудаваў уласны дом, які каштаваў 3000 рублёў,—пабудаваўшы дом, ён уступіў у партыю.

Скажэце, падсудны, як па-вашаму, чаму скончыў самагубствам Багайскі,—пытае ў Шкурава тав. Гінзбург—старшыня суду.

— Полагаю, что вам это более ясно,—адказвае Шкураў.

— Ну ўсё-ж. Вы зьяўляе[...] ўдзельнікам прычын.

— Полагаю, что с моей стор[...] нет ни на йоту причины в [...] смерти..

— Хто над ім мог зьдзекава[...]

— Полагаю, грамадзяне судз[...] даведацца аб гэтым ад вас.

Шкураў задумаў тонка, але н[...] абарваласяі. Ён спрабаваў п[...] заць сябе, як, прыгнечанага [...] гайскім і рабкорамі насьценгаз[...]

— Шкурау,—кажа ён сам,—[...] зьняты з пасады загадчыка с[...] цыі, выкінуты з ІТС, Шкураву [...] нізілі аклад,—аднак Шкура[...] пятлю не пайшоў.

— Ну, усё-ж такі, а чаму Ба[...] скі пайшоў на гэта?

— Бачыце, грамадзяне судз[...] я наглядаў за жыцьц м. Раб[...] напрыклад, раней, ці самы ап[...] нават жабрак у пятлю ня і[...] А хто, бывала, і канчаў жы[...] самагубствам, дык, як газэты п[...] лі, гэта быў абшарнік ці ку[...] якому жыцьцё надаела...

— Што вы хачаце гэтым сказ[...] ці Багайскаму таксама жыцьцё [...] даела?

На гэта Шкураў не адказва[...] маўчыць. Вывад ён прапануе [...] зрабіць самім.

Пастунова высьвятляецца яг[...] цыяльнае абліччa. Перад намі [...] ня Шкураў,—хворы, прыгнеч[...] Багайскім чалавек, якім абві[...] чаны імкнецца сябе прадставі[...] Шкураў—сапраўдны клясавы [...] раг—адзін з галоўных вінава[...] трагічнай і жудаснай сьмерці [...] дактара насьценнай газэты—„С[...] такавек“.

А. КАЛІТ[...]

Шклоў, 15-1-30 г.

Краіне патрэбны чырвоныя спэцыялістыя

БЯЗ УСЯКІХ АДЦЯЖАК ВЫКАНАЦЬ ДЫРЭКТЫВУ ПАРТЫІ!

Малейшая павольнасьць, непаваротлівасьць і адцяжка ў падрыхтоўцы кадраў зьяўляецца тормазам выкананьня пяцігодкі

ЦК абавязвае Дзяржплян, ВСНГ, НК Земляробства і народныя камісарыяты асьветы распрацаваць на працягу 3-х месяцаў пяцігадовы плян падрыхтоўкі спэцыялістых вышэйшай і сярэдняй кваліфікацыі, а таксама будаўніцтва новых вышэйшых тэхнічных навучальных установаў ды тэхнікумаў у адпаведнасьці з конкрэтнымі патрэбамі галін народнай гаспадаркі і яе асобных раёнаў.

(З пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б)

РОБІМ ДАТЭРМІНОВЫ ВЫПУСК

У зьвязку з соцыялістычнай рэконструкцыяй сельскай гаспадаркі Беларусі патрэбна шмат кадраў аграномаў і організатараў колектывізацыі вёсак. З гэтай мэтай Беларуская Сельска-Гаспадарчая Акадэмія (Горкі) робіць паскораны выпуск 4-га курсу; аграномічнага і факультэту колектывізацыі.

Для скончыўшых сельска-гаспадарчыя тэхнікумы, навучаньне ў Акадэміі абмяжоўваецца **да двух год**, а для таго, каб не пагоршылася якасьць спэцыялістых, мы ўжо прыступілі да пераходу ад лекцыйнай сыстэмы да цыклявой і лябараторнай прапрацоўкі вучэбнага матар'ялу. Таксама мяркуем зрабіць сёлета падвойны прыём у Акадэмію, зьвярнуўшы ўвагу на павялічэньне пролетарскага асяродку, бо ў мінулым годзе пролетарскі асяродак быў незадавальняючы, і датаго-ж дрэнна падрыхтаваны.

Выходзячы з гэтага, трэба гарадзкім організацыям комсамолу ўзяцца за організацыю курсаў падрыхтоўкі ў ВНУ рабочых і батракоў зараз-жа. Правесьці належную працу ў вячэрніх школах рабочай моладзі ўзвышанага тыпу аб значэньні сельска-гаспадарчай адукацыі, паставіўшы перад сабой задачу: **75 проц. прыёму ў ВНУ павінны складаць рабочыя і батракі.**

Для больш пасьпяховага ходу работы і падцягваньня адстаючых організацый у гэтай рабоце, лічу мэтазгодным праз „Чырвоную Зьмену" рабіць пераклічкі гарадоў па пытаньню ходу падрыхтоўкі рабочага маладняка ў ВНУ і ВТНУ.

Студэнт 2-га курсу колгаснага ф-ту, Сельска-Гаспадарчай Акадэміі Еф. З.

БАРАЦЬБА ЗА КАДРЫ--БАРАЦЬБА ЗА СОЦ. ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ

Барацьба за кадры, ёсьць барацьба за якасьць продукцыі і дасканалае аўладаньне сродкамі вытворчасьці. Але аднаго прызнаньня неабходнасьці падрыхтоўкі кадраў—мала. Патрэбна скласьці сапраўдную магчымасьць правядзеньня пастаноў партыі па гэтаму пытаньню ў жыцьцё.

Між тым, некаторыя ўстановы, прадпрыемствы, ячэйкі і райкомы да гэтага часу не зразумелі гэтай простай ісьціны і ня толькі не праводзяць дэкрэтаванага звальненьня студэнтаў ад працы, але бязупынна нагружаюць партыйцаў і комсамольцаў новымі заданьнямі, чым і адрываюць іх ад вучобы.

Студэнты рабфаку часьцяком заяўляюць мне, што ў іх па дзьве-тры і нават 5 нагрузак, а калі,—кажуць яны, — пачнеш адмаўляцца,—пагражаюць зьняцьцем з вучобы. Гэта ненармальнае зьявішча, яму трэба як-мага хутчэй пакласьці канец. Падрыхтоўка кадраў—ёсьць сур'ёзьнейшая і адказьнейшая задача, пастаўленая партыяй; да яе трэба адносіцца з большай уважлівасьцю і адказнасьцю.

Я прыпамінаю, як на пытаньне падрыхтоўкі кадраў глядзеў Уладзімер Ільліч, з якім я сустракаўся на працягу паўтара год (18 і 20 год). Ня гледзячы на самы небясьпечны час грамадзянскай вайны, тав. Ленін, пры сваёй нагружанасьці, ня толькі цікавіўся думкай наведваючых нас замежных вучоных і палітычных дзеячоў аб нашай працы, але знаходзіў магчымасьць удзяляць увагу нават гаспадарчым адміністрацыйным пытаньням такой невялічкай установы, як наша, у той час „Акадэмія Працоўнай Асьветы", ставіўшая перад сабой мэту падрыхтаваць настаўнікаў з рабочых.

Памятаю, што тав. Ленін сам выклапатаў аванс у 1000000 рублёў сказаўшы: „Ну і дасталося-ж мне", бо тады цяжка было дабіцца такога вялікага авансу. Тав. Цюрупе, у той час Наркомпроду, т. Ленін прапанаваў: ва што-б там ні стала выдаць нашым курсантам чырвонаармейскі паёк, а тав. Склянскаму—вызваліць курсантаў ад вайсковай службы. І, нарэшце, калі мы самі былі прымушаны сячы дровы ў Райстанскім гаі, дык на нашу заяву т. Ленін наклаў рэзолюцыю: „Выдаць дровы поўнасьцю, без утрыманьня на армію".

З гэтага відна, як ужо ў той час Ленін цаніў працу нашых навучальных установаў. А зараз, калі ўся партыя і ўрад ставіць востра пытаньне аб кадрах, знаходзяцца людзі, якія тармозяць падрыхтоўку гэтых кадраў. Неабходна завастрыць увагу партыйна-савецкай і комсамольскай грамадзкасьці навокал гэтага пытаньня.

Трэба зрабіць усё, каб даць магчымасьць выконваць сур'ёзна і глыбока ўсе заданьні навучальнай установы, не адгаварваючыся нагрузкамі. Організацыі, якія нерацыянальнай нагрузкай студэнцтва зрываюць гэтую работу, трэба прыцягваць да адказнасьці і кваліфікаваць іх паводзіны, як сабатаж дырэктывы партыі ў падрыхтоўцы кадраў.

Выкладчык Мен. Рабфаку Т. ЗАРУБІК.

ДАРОЖНІК ВЫВУЧАЕ АПАЛ І ВЭНТЫЛЯЦЫЮ

У нашых навучальных установах увядзеньне чаго-небудзь новага, ломку якое-небудзь старое формы, сустракае сьцяна консэрватызму, нярухомасьці кіруючых органаў. Так было і ў Менскім Політэхнікуме. Сапраўды,—колькі каштоўных прапаноў, рацыяналізацыі акадэмічнай працы патанула ў портфэлях навучальнай часткі?

Тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва патрабуюць іншых, больш шпаркіх тэмпаў падрыхтоўкі кадраў. Трэба выкінуць з програм асобных аддзяленьняў дысцыпліны, якія ня маюць адносін да тае ці іншае спэцыяльнасьці. А ў нас пакуль што на дарожным аддзяленьні выкладаецца цэлых 5 непатрэбных дысцыплін. У тым ліку: **апал і вэнтыляцыя, часткі будынкаў і інш.**, якія ніякага дачыненьня да спэцыяльнасьці дарожніка ня маюць. Зьнішчыўшы ўсё непатрэбнае ў програмах, можна сьмела політэхнікум скончыць у 3 з паловай гады, замест 4, а ўноў набраныя курсы ўсіх аддзяленьняў перавесьці на 3-х гадовы тэрмін навучаньня.

Нерацыянальна скарыстоўваюцца памяшканьні політэхнікуму. Летам будынак пустуе. Ёсьць усе падставы рабіць вясеньнія прыёмы, а хэмічнае аддзяленьне перавесьці на летнія заняткі.

Пытаньням, як хутчэй і лепей выпушча ь спэцыялістых, павінны займацца не адны студэнты, але і настаўніцкі склад, чаго нельга сказаць адносна выкладчыкаў Менскага Політэхнікуму.

В. Савасьцьянаў.

ШКЛЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЗАСТАНЕЦЦА БЕЗ КВАЛІФІКАВАНЫХ КАДРАУ

НА 3000 РАБОЧЫХ—ТОЛЬКІ 9 ВУЧНЯЎ.—НА 7 ЗАВОДАЎ—АДНЫ ПРОФТЭХКУРСЫ. — РЫХТУЮЦЦА КАДРЫ ПАВЯРТАЛЬШЧЫКАЎ, А НЕ КВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ. ГАНЕБНАЯ 1,4%. —У ПРОМФІНПЛЯНЕ ШКЛОТРЭСТУ НЕ ПРАДУГЛЕДЖАНЫ ВОДПУСК СРОДКАЎ НА ПАДРЫХТОЎКУ РАБОЧАЙ СІЛЫ

Патрэбны тэрміновыя і рашучыя захады!

Рост шкляной прамысловасьці Беларусі і вялікі недахоп кваліфікаваных рабочых патрабуе максымуму ўвагі з боку ўсіх гаспадарчых, профэсыянальных і комсамольскіх організацый да пытаньня падрыхтоўкі кадраў. Да апошняга часу **гэтаму пытаньню, бадай што, не ўдзялялася ніякай увагі.** Не дарма мы вазлядаем на цэлым шэрагу заводаў („Труды" Полацак, „Ільліч" Магілеўшчына і інш.), што прычыны недахопу кваліфікаваных рабочых **цэлыя зьмены пустуюць варштаты.**

Майстрам можа быць толькі сын майстра

Формай падрыхтоўкі кадраў яшчэ да гэтага часу лічыцца індывідуальнае вучнёўства, якое не апраўдала сябе, да таго-ж і праходзіць яно бяз усякай сыстэмы, бяз пляваў (перад абедзеным перапынкам шкладуў пакавае вучню, як трэба дзьмуць), зразумела, што пры такой пастаноўцы вучнёўства выпушчае рабочых зусім **нездавальняючай кваліфікацыі**, незнаёмых з цэлым шэрагам процэсаў вытворчасьці.

Майстры навучаюць у большасьці выпадкаў ня тых, каго да іх прымацоўваюць, а тых, якіх яны самі лічаць патрэбным вучыць. І па сёньнешні дзень на шклозаводах ёсьць погляд, што: **„майстрам шклодувам можа быць толькі сын майстра".**

Характэрная лічба, — з выпушчаных у 28-29 годзе вучняў 70 проц. — дзеці майстроў, прычым апошнія навучыліся кваліфікацыі на працягу 1—2 год, у той час, калі прыбыўшыя на завод дзеці іншых рабочых і батракоў сядзяць на працягу **4—5 год** на падсобнай рабоце (адноска, павяртальшчык) і, у лепшым выпадку, баначнікамі.

Тэорытычнай падрыхтоўцы рабочай моладзі да гэтага часу не ўдзялялася ўвагі. **З 7 шкляных заводаў БССР, толькі на адным у мінулым годзе былі профтэхнічныя курсы.** У гэтым годзе такія профтэхкурсы організавалі на 5 заводах, але **большая** частка з іх **ня мае** кіраўнікоў па спэцыяльных дысцыплінах (тэхнолёгія шкла).

На 3000 рабочых — 9 вучняў

Рабочая моладзь, вышаўшая з вучнёўства, надзвычайна дрэнна прасоўваецца на кваліфікаваную работу, гэта падцьвярджаюць весткі, узятыя намі па 4 заводах, з якіх відаць, што з 110 чалавек, скончыўшых навучаньне, у майстры-выдувальшчыкі пашло толькі 31 чалавек, што ў адносінах да колькасьці рабочых, якія працуюць на гэтых заводах (2250 чалавек)—складае 1,4 пр. Гэта зьвесткі за 28-29 гаспадарчы год. У гэтым годзе справа стаіць **яшчэ горш**,—па маючыхся вестках з 5-ці заводаў, агульнай колькасьцю ў 3000 рабочых, прымацавана для індывідуальнага навучаньня толькі на адным заводзе „Ноўка" усяго 9 чалавек, ня гледзячы на тое, што колдагаворам прадугледжана організацыя на заводзе вучнёўскай брыгады.

Нават пасьля таго, як усесаюзная нарада па падрыхтоўцы кадраў для хэмічнай прамысловасьці адзначыла, што **індывідуальная форма навучаньня сябе не апраўдывае і што: найлепшай і най больш організаванай формай падрыхтоўкі новай кваліфікаванай сілы зьяўляецца школа ФЗВ"**, гаспадарчыя органы ўсьцяж імкнуліся ліквідаваць ФЗВ і замяніць іх індывідуальным вучнёўствам. Гэтаму пытаньню не ўдзяляецца належнай увагі на мясцох з боку профэсыянальных, партыйных і комсамольскіх організацый. Самым бесшабашным чынам ігнаруецца пастанова тэй-жа нарады аб тым, што: **„50% кваліфікаванай рабочай сілы, патрэбных для пяцігодкі, павінна падрыхтаваць школа ФЗВ".** Кіраўнікі шкло-трэсту лічаць, што асноўнай формай падрыхтоўкі кадраў зьяўляецца індывідуальнае вучнёўства (!?) Галоўны камітэт шкло-трэсту СССР адпусьціў для Беларусі 50 тысяч рублёў для організацыі у 29-30 годзе школы ФЗВ, але нашы „разумнікі" з беларускага шкло-трэсту катэгорычна выступаюць супроць ФЗВ, лічачы, што апошняя нібы сябе не апраўдала і што яна выклікае шмат непатрэбных затрат(!?)

Ніводнай капейкі на падрыхтоўку кадраў

Работнікі беларускага трэсту сваю атаку на ФЗВ правялі і ў промфінпляне шкляной прамысловасьці на 29-30 год. **У апошнім непрадугледжана водпуску ніводнай капейкі на падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых і тым больш праз школу ФЗВ.**


Прыведзеныя факты з усёй яскравасьцю гавораць аб тым, што падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў для шкляной прамысловасьці знаходзіцца напярэдадні зрыву па віне чыноўнікаў з Шклотрэсту. Гэтага дапушчаць нельга. Трэба каб тэрміновым парадкам органы РСІ заняліся гэтым пытаньнем.

М. Храпуновіч.

Не чакаў...

Праграмы некаторых ВНУ перагружаны ўсялякай трухой: Студэнт канчае ВНУ і... ня ведае нават што такое трактарызацыя...

(З допісаў юнкора)



— Уф... Гэта што за дзіковіна?..

Усім РК КСМ Менскай акругі

Мен АК ЛКСМБ паведамляе, што 23-га студзеня г. г., а 10 гадз. раніцы склікаецца Акруговая АПА нарада. На нарадзе будуць пастаўлены інфармацыі з мейсц аб ходзе і становішчы палітадукацыі, і трохмесячніку Беларускай Пролетарской Культуры. Для чаго прапагандыстыя павінны падрыхтаваць матар'ял і прывезьці з сабой.

МЕН. АК КСМ

Пасьля анты-калядная кампаніі

ДА СЫСТЭМАТЫЧНАЙ УПАРТАЙ БАРАЦЬБЫ!

У дні каляд царкоўнікі і сэктанты агітавалі супроць колектывізацыі, супроць мерапрыемстваў савецкай улады

ПАД СЬЦЯГАМІ САЮЗУ ВАЯЎНІЧЫХ БЯЗБОЖНІКАЎ МАЦНЕЙ УДАРЫМ ПА КУЛАЦКА-ПАПОЎСКАЙ СВОРЫ

Клясавы вораг арудуе

У самым глухім кутку Шклоўскага раёну знаходзіцца Ардацкі сельсавет. У сельсавеце маюцца 3 вёскі—Вордаць, Радзішчына і Шастакі.

На вёсцы Радзішчына арудуе мясцовы поп. Радзішчанцы строга выконваюць закон самаабкладаньня падаткам у карысьць папа. Плацяць яму з душы 10 фунтаў рознага збожжа.

Поп зьбірае пудоў калля 60—70 збожжа.

Ў Шастакох маецца царква і свой штат „служачых": поп, манах—Казлоў, манашка—Мініна Надзея. Гэтая „сьвятая тройка" моцна трымае ў руках шастакоўцаў. Манах Казлоў, сумесна з манашкай Мінінай, вядуць штодзённую агітацыю, рыхтуюць „свае кадры". Ад Казлова атрымаў манаскі сан і дырэктывы грамадзянін вёскі Масеянкі—Данкевіч Лаўрын. Апошні вядзе сваю працу ў в. Масеянках, праводзіць без дазволу адпаведных органаў сходы сялян, на якіх выступае з рознымі контр-рэвалюцыйнымі прамовамі.

Мініна вядзе адпаведную працу сярод маладога пакаленьня, яна падпарадкавала свайму ўплыву ўсіх вучняў шастакоўскай школы I-ай ступені. Вучні ходзяць кожны тыдзень у царкву, уцякаюць з лекцый да Мінінай. Там яны сьпяваюць „сьвятыя песьні". У Мінінай наладжваюцца „сьвятыя" вечары, на якія запрашаюцца моладзь і жанчыны з усёй вёскі. Там праводзяцца гутаркі аб жыцьці якога-небудзь сьвятога, а разам з гэтым і гутаркі супроць колектывізацыі. Пасьля пяюць „сьвяшчэнныя псальмы".

Старое пакаленьне шастакоўцаў цьвёрда выконвае ўсе пасты. Не бяруць цукру ў Ардацкай коопэрацыі, бо ён паскаромлены.

Вось прычыны, чаму ў Шастакох да гэтага часу няма колектыву. Вось чаму ў Шастакох наогул нічога новага няма. Пытаньне,—што-ж робіць грамадзкасьць?

Грамадзкасьць сельсавету і ячэйка КСМ пытаньнем аб гэтай „сьвятой" своры не займаецца. Клясавы вораг пад носам іх дзейнічае, агітуе, а грамадзкія організацыі нічога не робяць.

Мядзьведзеў.

Перагворым ачагі дурману ў ачагі культуры

* Працоўнае насельніцтва м. Халопенічы пастанавіла перадаць царкву і сынагогу пад культурныя патрэбы. На сходзе было завербавана 50 падпісчыкаў на газэту „Бязбожнік".

ГАРАДЗЕНСКІ.

* На анты-рэлігійным вечары, прысьвечаным анты-каляднай кампаніі, працоўнае насельніцтва м. Крупкі разам з дэпрызыўнікамі заслухалі даклад аб шкоднасьці рэлігіі ў соцыялістычным будаўніцтве. Пасьля дакладу вынесьлі рэзолюцыю, у якой патрабуюць ад РВК перадачы царквы пад культурную ўстанову, а званы—у фонд індустрыялізацыі краіны.

БАРКАН.

* У г. Н. Барысаве маецца вялікая царква, якая амаль увесь час пуставала. Зараз, па запатрабаваньню рабочых сходаў, Барысаўскі Гарсавет аддаў гэту царкву пад клюб чыгуначнікаў.

КУБЕЛЬ.

Наладзілі атырэлігійны карнавал

Сэктант з бутэлькаю ў руках, на якой напісана: „40°"... Жанчына, закаваная ў ланцугі, на якіх чорнымі літарамі напісана: „рэлігія"... Царква, дзе поп бесперапынку б'е ў званы, каб прыцягнуць людзей.

Дамавіна (труна) з надпісам: „рэлігія". А далей—плякаты, характарызуючыя вынікі ўраджаю пры колектыўным гаспадараньні і індывідуальнай гаспадарцы. Вось гэты карнавал, організаваны ў дні каляд комсамольскай ячэйкай пры Стара-Дароскай сямігодцы, прыцягнуў усё насельніцтва мястэчка. Пасьля карнавалу быў наладжаны вечар у кіно-тэатры, дзе пастаўлен даклад аб паходжаньні каляд. Па сканчэньні дакладу, аўдыторыя высунула прапанову аб адабраньні другой сынагогі і касьцёлу і перадачы іх пад культурныя ўстановы. Сотні рук падняліся ўгару,—аднагалосна ўхвалілі гэту прапанову. Адразу-ж вылучылі камісію па хадайніцтву перад адпаведнымі органамі аб перадачы гэтых установаў пад культурныя патрэбы.

Непагановіч.

Яму ня мейсца у комсамоле

У Забабскай ячэйцы КСМ, Гомельскай акругі ёсьць комсамолец Камсулёў Янка, які праводзіць усе рэлігійныя абрады і сьвяткуе ўсе рэлігійныя сьвяты. У дні каляд. ён сабраў некалькі беспартыйных хлапцоў; добра падвыпіўшы, яны разам накіраваліся на вечарынку. Там Камсулёў узьняў бойку з адным хлапцом; яго зьбілі і выкінулі на двор. Пасьля гэтай гулянкі комсамолец прахварэў некалькі дзён.

Я лічу, што такім комсамольцам ня мейсца ў шэрагах комсамолу,—яны толькі дыскрэдытуюць званьне комсамольцаў.

Чарка.

Званы—на пабудову трактараў

6-га студзеня ў м. Халопенічы адбыўся антырэлігійны вечар, на якім быў пастаўлены даклад аб паходжаньні каляд. У часе перапынку, адбыліся выклікі на соцспаборніцтва, на выпіску газэты «Бязбожнік». Сабрана каля 100 падпісчыкаў. Усю выпісаную антырэлігійную літаратуру падпісчыкі пастанавілі перадаць у чырвоныя куткі пры хатах-чытальнях.

Пасьля дакладу была аднагалосна прынята рэзолюцыя аб перадачы царквы, сынагогі і касьцёлу пад культурныя ўстановы, а званы зьняць і здаць дзяржаве на пабудову трактараў. Прапанову гэту аднагалосна ўхвалілі 490 чалавек, якія прысутнічалі на сходзе.

Гірс Алесь.

Пачын, па якому трэба раўняцца

Залінейная гомельская комсамолія распачала работу па правядзеньню трохмесячніка беларускай пролетарскай культуры і культуры нацменшасьцяў.

Распрацованы пляны. Праведзена нарада комсамольскага актыву (але кепска, што ня з усіх ячэек былі таварышы). Шмат якія ячэйкі ўжо распачалі работу.

У плянах усіх школ вызначана па 4 гадзіны для вывучэньня пяцігодкі культурна-гаспадарчага будаўніцтва СССР. Да 20 студзеня праводзяцца комсамольскія сходы па пытаньню: „Чарговыя задачы беларусізацыі і барацьба з шовінізмам усіх колераў і нацдэмократызмам".

16-га студзеня праводзіцца нарада пачынаючых пісьменьнікаў.

26-га студзеня будзе праведзен сход рабочай моладзі з дакладам „Беларускі Дзяржаўны Тэатр і кіно ў нацыянальным пралетарскім культурным будаўніцтве.

На люты месяц вызначана правесьці літаратурны вечар з выступленьнямі беларускіх пролетарскіх пісьменьнікаў.

Дыспут па творах Зарэцкага: „Пажоўклая кветка", „Падарожжа на новую зямлю" і іншых, з мэтай высьвятленьня наяўнасьці нацыянал-дэмократызму.

На заводзе „Ланцуцкага", у тэхнікуме і 3-й школе для вопыту з студзеня месяца пачнем кніжны „эстафэтны" бег па творах Чарота: „Босыя на вогнішчы" і „Саматканая сьвітка".

30-га студзеня склікаецца сход актыву—ставіцца даклад на тэму „Гісторыя Беларусі".

Па правядзеньню трохмесячніка выклікаем на соц. спаборніцтва Гомельскі гарадзкі райком комсамолу па вышэйпаказаным мерапрыемствам і наступным пытаньням:

За трохмесячнік перавесьці работу райкомаў і ячэек на бел мову.

100 проц. выкананьне лёзунгу: „Кожны пісьменны комсамолец павінен абучыць аднаго няпісьменнага".

Вывучэньне актывам гісторыі Беларусі. 100 проц. выпіска „Чырвонай Зьмены".

У канцы трохмесячніку правесьці політ-бой з Гомельскай гарадзкой комсамольскай організацыяй з мэтай выкананьня пастаўленых умоваў пытаньняў і наогул лепшага выкананьня пляну трохмесячніку.

ДЗЯТКОВА.

Юнкоры пішуць

— Як ні стараліся кулакі вёскі Старых Усавіч (Стара-Дароскі раён) сарваць організацыю колгасу, але нічога ня вышла. Бядняцка-серадняцкае сялянства гэтай вёскі ўступіла ў колгас пад назвай „Чырвоныя Усавічы".

В. СУЛІМЧЫК

— Буда-Сафіеўская і Мілашэвіцкая комсамольскія ячэйкі ў дзень сьвяткаваньня Х-цігодзьдзя КІМ'у організавалі па аднаму колгасу. У Буда-Сафіеўскі колгас паступіла ўся комсамольская ячэйка ў ліку 12 комсамольцаў, якому далі назву імя „Х-цігодзьдзя КІМ'у".

Я.

Дзяк Гарэльчык Цітаўскай царквы публічна адмовіўся ад свайго сану, кажучы, што гэта дурман. Сапраўды-ж Гарэльчык і зараз ходзіць у царкву, пераапранаючыся ў другую адзежыну.

А зрабіў гэта ён для таго, каб абмануць мясцовыя савецкія органы, ён ходзіць штодзённа ў сельсавет і просіць, каб яго залічылі пайшчыкам коопэрацыі і далі права голасу.

Мусіць намеры ваўка у „авечай скуры" ня збудуцца.

„Чакклерь ст".

Тэлеграмы

Барыкады на вуліцах Вормса

БЭРЛІН, 16. У Вормсе (на захадзе Нямеччыны) адбыліся буйныя сутычкі паміж паліцыяй і рэволюцыйнымі рабочымі.

За апошнія дні беспрацоўныя Вормса пад кіраўніцтвам компартыі правялі шэраг сходаў і дэмонстрацый на вуліцах з мэтаю барацьбы за свае патрабаваньні. Начальнік паліцыі апублікаваў загад аб забараненьні дэмонстрацый, але ня гледзячы на гэта ў панядзелак 2000 беспрацоўных сабраліся на дэмонстрацыю.

Паліцыя напала на дэмонстрантаў і пачала зьбіваць іх прыкладамі і гумовымі палкамі. Паліцэйскія накінуліся на выступаўшага на сходзе комуніста члена прускага абласнога парляманту Мюльлера, сьцягнулі яго з трыбуны і зьбілі да крыві.

У гэты час з прадпрыемстваў падасьпелі новыя ўдзельнікі дэмонстрацыі, лік якіх у агульнай складанасьці дасягнуў 4000 чалавек. Паліцыя ізноў атакавала дэмонстрантаў.

Сутычкі працягваліся да паўночы. Дэмонстранты з мэтаю абароны ад паліцыі зрабілі барыкады.

Нарэшце паліцыя прыбегла да агнястрэльнай зброі і арыштавала шмат рабочых.

З гораду Дармштадту на аўтамабілі прыбылі паліцэйскія падмацаваньні з кулямётамі і ручнымі гранатамі. Сілы дармштадзкай і Вормскай паліцыі пачалі па бэрлінскаму прыкладу, бесперастанку страляючы, ачышчаць вуліцы з крыкамі:

„Зачыняць вокны і дзьверы!»

Страляніна працягвалася да 10-ці гадзін вечару.

Бандыцкі налёт фашыстых

(*Ліст з Фінляндыі, атрыманы на мове эспэранто*)

Рабочая моладзь нашай акругі організавала свой зьлёт у гор. Лануа. На гэтым зьлёце прысутнічалі прадстаўнікі ад моладзі суседняй акругі Ваазан.

На рабочы дом, дзе адбываўся зьлет, утварылі налёт фашыстыя, якія і забаранілі адчыніць зьлёт. Яны зьбілі некаторых дэлегатаў і згвалцілі некалькі дзяўчат быўшых на зьлёце.

Гэтая нячуваная па сваёй сутнасьці справа стала хутка вядома ўсім жыхаром акругі. Давялося пасьля даведацца, што ўсю гэтую справу організавалі соцыял-дэмократы сумесна з фінскім фашыскім саюзам.

Цяпер соцыял-дэмократы і фашыстыя вядуць жорсткую атаку супроць рабочай моладзі. Усе сходы забаронены. Урад дапамагае фашыстым праводзіць тэрор. Фашыстыя спрабавалі організаваць свае „народныя сходы", але на іх ніхто з рабочых ня прыходзіў.

Сходы былі організаваны выключна для пропаганды барацьбы супроць комуністых. І ўсе-ж ня гледзячы на гэтыя перашкоды рабочая моладзь Фінляндыі змагаецца і будзе змагацца за сусьветную перамогу пролетарыяту.

Т. О.

Фінляндыя.

Крывавая сутычка паліцыі з гарнякамі

ЛЁНДАН, 17. У Сэсжноку (новы Паўднёвы Ўэльс) адбылася сутычка паміж бастуючымі гарнякамі і паліцыяй. Паліцыя раніла 10 чал.

З фото-апарат[ам] па Менску

Менскі працколектыў „...сыр'ё" зараз шырока раз[горнуў] сваю працу. Працколектыў м[ае] адзяленьні амаль у кожнай [...] мястэчку, горадзе Беларусі. З[а] год працколектыў экспарт[аваў] больш за 15 тысяч пудоў [...]. У працколектыве (Менскае [адзя]леньне) зараз працуе 178 ч[ал.] з іх 150 жанчын.



На здымку: Прасуюць трап[...] рад адпраўкай па базу.

Рэволюцыйныя в[ы]ступленьні студ[эн]цтва

ТОКІЁ, 16. Па апошніх в[естках] з Карэі, у Сэуле забаставала [студэнцтва] 5 вышэйшых навучальных ус[тановаў]. Студэнты дэманстравалі з чыр[вонымі] сьцягамі. Каля 40 чалавек [арыш]тавана.

Турэмны рэжым давё[ў да] вар'яцтва

ПРАГА, 16-1. Комуністы та[...] які знаходзіцца ўжо больш [...] да ў турме, у Рымашомбаце [...] яцеў. Ня гледзячы на гэта [...] працягваюць трымаць у тур[ме ...] бочыя Чэхаславакіі надзвы[чайна] абураны гэтым фактам. Усе [...] дамленьні, публікуемыя га[зэтамі] компартыі конфіскуюцца.

Справа контр-рэволюцы[яне]раў „кірылаўцаў"

ЛЕНІНГРАД, 15. 17-га ст[удзеня] выязная сэсія вайсковай [...] Вярхоўнага суду СССР пачына[е раз]хаць справу контр-рэволюцы[янераў] фальшывамонэтчыкаў «кірыла[ўцаў»], якія былі цесна зьвязаны з р[ас]скімі эмігрантамі і каралём Э[...] гам.

«Кірылаўцы» Фядотаў, Карсакоў і Іткін у сваёй [дзей]насьці ярa выступалі супро[ць са]вецкай улады, усяляк стара[ліся] падарваць і дэзорганізаваць [...] вы зварот у СССР, пакладаюч[ы] сілы на падрыхтоўку кадраў [для] ўзброеных выступленьняў с[упроць] савецкай улады.

Адказны рэдактар
Рэдколег[ія]

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел № 599